# Экалагічная палітыка кампаніі А1.





# Зварот Генеральнага дырэктара А1.

Вядзенне сацыяльна адказнага бізнесу для нас – гэта не толькі адзін з асноўных прынцыпаў работы, але і магчымасць змяняцца і змяняць свет вакол сябе да лепшага, звяртаць увагу на тое, што лічым важным, а таксама дапамагаць тым, каму гэта неабходна. Нашы прыярытэты – дапамога дзецям, развіццё інклюзіўнага грамадства, падтрымка нацыянальнай ідэнтычнасці і культуры, а з нядаўняга часу і экалагічныя паводзіны.

На глабальным узроўні А1 імкнецца да таго, каб мінімізаваць уздзеянне на экалогію за кошт прымянення энергаэфектыўных сістэм і налад для абслугоўвання сетак сувязі і іх кампанентаў, скарачэння «вугляроднага следу» пры выкарыстанні аднаўляльных крыніц энергіі, пісьменнага кіравання рэсурсамі і адходамі, што ў выніку прыводзіць да адчувальнага рэзультату для навакольнага асяроддзя.

Мы верым, што кожны крок на гэтым шляху, вялікі і маленькі, дапамагае ісці да адзінай мэты, і ікнёмся зацікавіць ідэяй беражлівага стаўлення да прыроды і экалагічных паводзін нашых супрацоўнікаў, кліентаў і ўсіх, для каго важна, які свет мы пакінем пасля сябе будучым пакаленням. У сваю чаргу, мы спадзяёмся, што нашы імкненні і дзеянні зробяць унёсак у агульную справу аховы навакольнага асяроддзя, а А1 стане годным прыкладам для іншых бізнесаў у Беларусі.

Генеральны дырэктар А1
Гельмут Дуз.



# 1. Прызначэнне.

Экалагічная палітыка Унітарнага прадпрыемства па аказанні паслуг «А1» (далей – «Палітыка») устанаўлівае патрабаванні да кіравання дзейнасцю Унітарнага прадпрыемства па аказанні паслуг «А1» (далей – «кампанія А1»), якая заклікана мінімізаваць уздзеянне на навакольнае асяроддзе.

Дадзеная Палітыка заснавана на інтэграцыі прынцыпаў ESG (Environmental, Social and Corporate Governance) у стратэгію ўстойлівага развіцця кампаніі і распрацавана з мэтай устанаўлення асноўных прынцыпаў і абавязацельстваў А1 у галіне аховы навакольнага асяроддзя і забеспячэння экалагічнай бяспекі, шляхоў і механізмаў іх рэалізацыі.

Палітыка ўводзіцца ў дзеянне з даты яе зацвярджэння і распаўсюджваецца на ўсіх супрацоўнікаў А1, а таксама знаходзіць сваё адлюстраванне ва ўсіх аспектах дзейнасці кампаніі.



# 2. Агульныя палажэнні.

Кампанія А1 – правайдар тэлекамунікацыйных паслуг, ІКТ- і кантэнт-паслуг у Беларусі. Камерцыйную дзейнасць кампанія распачала 16 красавіка 1999 г., стаўшыся першым мабільным аператарам стандарту GSM у краіне. З лістапада 2007 г. уваходзіць у склад міжнароднай групы A1 Telekom Austria Group, якая з’яўляецца еўрапейскім падраздзяленнем транснацыянальнага холдынгу América Móvil, аднаго з найбуйнейшых сусветных правайдараў бесправадных паслуг. Да жніўня 2019 г. кампанія вяла аперацыйную дзейнасць пад брэндам velcom.

Абанентамі мабільнай сувязі кампаніі А1 у Беларусі з’яўляюцца больш за 4,9 млн чалавек, звыш 1 млн хатніх гаспадарак маюць магчымасць доступу да сеткі фіксаванай сувязі па тэхналогіях GPON і Ethernet ва ўсіх абласных гарадах і большасці раённых цэнтраў. Акрамя таго, А1 аказвае паслугі лічбавага тэлебачання IPTV пад брэндам VOKA, а таксама паслугі захоўвання дадзеных і воблачныя сэрвісы на базе ўласнага дата-цэнтра, аднаго з найбуйнейшых у краіне. У кампаніі працуе каля 3000 чалавек, а фірмовыя цэнтры продажу і абслугоўвання размешчаны ва ўсіх буйных населеных пунктах краіны.

У адпаведнасці з прынцыпамі ESG (Environmental, Social and Corporate Governance) кампанія А1 актыўна рэалізуе сацыяльна значныя праекты ў сферы карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці. У 2020-м да ліку ўжо існуючых прыярытэтаў, якія ўключаюць дапамогу дзецям і падтрымку нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, дадаўся новы кірунак – экалогія.

Кампанія А1 надае асаблівае значэнне паляпшэнню экалогіі і навакольнага асяроддзя як асновы ўстойлівага развіцця бізнесу, дзяржавы і грамадства і разглядае экалагічны аспект як адзін з галоўных прынцыпаў сваёй дзейнасці.

Кампанія А1 ацэньвае дзейнасць па ахове навакольнага асяроддзя як неад’емную частку сваёй паўсядзённай працы, у поўнай меры ўсведамляючы неабходнасць падтрымання экалагічнай раўнавагі, забеспячэння экалагічна стабільнага сацыяльна-эканамічнага развіцця грамадства.



Пры ажыццяўленні сваёй дзейнасці кампанія А1 усведамляе адказнасць за захаванне навакольнага асяроддзя, бяспеку і надзейнасць пры выкананні абавязацельстваў у рамках прыярытэтаў, замацаваных дадзенай Палітыкай, а таксама прымае на сябе абавязацельствы мінімізацыі дадзенага ўздзеяння, уліку яго наступстваў, магчымай кампенсацыі нанесенай шкоды.

Абавязацельствы і стратэгічныя мэты, вызначаныя ў дадзенай Палітыцы кампаніі А1, накіраваны на забеспячэнне захавання спрыяльнага навакольнага асяроддзя і прыродна-рэсурснага патэнцыялу.



# 3. Прынцыпы.

- Захаванне ў працэсе дзейнасці кампаніі А1 устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і ратыфікаванымі міжнароднымі дагаворамі патрабаванняў, норм, абавязацельстваў у галіне аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага прыродакарыстання, экалагічнай бяспекі.

- Прыхільнасць да прынцыпаў устойлівага развіцця пры планаванні і ажыццяўленні дзейнасці кампаніі А1: рэалізацыя кампаніяй А1 сваіх эканамічных інтарэсаў не павінна пагаршаць існуючую эканамічную сітуацыю, якасць жыцця і здароўя насельніцтва, прыводзіць да нанясення шкоды навакольнаму асяроддзю, асобным яе кампанентам.

- Адсутнасць перашкод да рэалізацыі супрацоўнікамі кампаніі А1, а таксама грамадзянамі Рэспублікі Беларусь, закранутымі дзейнасцю кампаніі А1, свайго канстытуцыйнага права на спрыяльнае навакольнае асяроддзе.

- Улік патэнцыйных экалагічных рызык пры прыняцці кіраўніцкіх рашэнняў, якія вызначаюць стратэгію развіцця кампаніі А1. Улік эколага-эканамічных і прыродаахоўных аспектаў нароўні з традыцыйнымі фінансава-эканамічнымі параметрамі.

- Павышэнне энергетычнай эфектыўнасці і вырашэнне праблемы энергазберажэння ў комплексе мер.

- Забеспячэнне скарачэння выкідаў $CO_2$ у выніку дзейнасці кампаніі, папярэджання і памяншэння негатыўнага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў працэсе дзейнасці кампаніі А1, прыняцце ўсіх магчымых мер па кампенсацыі нанесенай ёй шкоды.



- Скарачэнне ўтварэння адходаў і экалагічна бяспечнае абыходжанне з імі.

- Адкрытасць і даступнасць вынікаў экалагічнага маніторынгу для ўсіх зацікаўленых асоб.

- Стварэнне і развіццё ў кампаніі А1 экалагічнай культуры, экалагічных каштоўнасцей, фарміраванне іміджа кампаніі А1 як экалагічна арыентаванай кампаніі, адданай прынцыпам карпаратыўнай сацыяльнай адказнасці.



# 4. Мэта і задачы.

4.1. Мэтай дадзенай Палітыкі кампаніі А1 з'яўляецца павышэнне ўзроўню экалагічнай бяспекі, комплексны падыход да рацыянальнага выкарыстання энергетычных і прыродных рэсурсаў, мінімізацыя шкоды навакольнаму асяроддзю ад дзейнасці кампаніі А1, захаванне спрыяльнага навакольнага асяроддзя для будучых пакаленняў, пазіцыянаванне ў грамадскай думцы кампаніі А1 як экалагічна арыентаванай кампаніі.

Дадзенай Палітыкай вызначаны прыярытэтныя кірункі дзейнасці:
- энергаэфектыўнасць і энергазберажэнне;
- скарачэнне выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу;
- памяншэнне смеццевага следу.

Для кожнага з іх будзе распрацаваны і ажыццёўлены комплекс канкрэтных мер на 2021–2025 гг. з магчымасцю далейшай пралангацыі.

4.2. Задачы і спосабы іх рэалізацыі:

4.2.1. Энергаэфектыўнасць і энергазберажэнне:

- Захаванне долі аднаўляльных крыніц энергіі ў структуры энергаспажывання. Выкарыстанне экалагічна бяспечных крыніц энергіі, такіх як фотаэлектрычныя панэлі.

- Укараненне на аб'ектах кампаніі А1 энергазберагальных і рэсурсазберагальных тэхналогій. Рэалізацыя мерапрыемстваў па энергазберажэнні.

- Тэхналагічнае перааснашчэнне і паступовы вывад з эксплуатацыі састарэлага абсталявання, укараненне найлепшых існуючых тэхналогій у працы кампаніі А1.

- Зніжэнне ўдзельнага энергаспажывання ў працэсе аказання паслуг. Зніжэнне долі дапаможных працэсаў у агульным энергетычным балансе кампаніі А1.



4.2.2. Скарачэнне выкідаў вуглякіслага газу ў атмасферу:

- Павелічэнне долі электрычнага аўтатранспарту ў аўтапарку кампаніі.
- Скарачэнне ўласнага аўтапарка кампаніі.
- Выкарыстанне больш эканамічнага хуткаснага рэжыму кіравання аўтамабіля на трасе.
- Памяншэнне колькасці камандзіровак (на самалёце і аўтамабілі).
- Павелічэнне колькасці велапарковак каля офісаў і іншых аб’ектаў кампаніі.

4.2.3. Памяншэнне смеццевага следу:

- Скарачэнне ўтварэння адходаў і забеспячэнне бяспечнага абыходжання з імі, забеспячэнне паасобнага збору бытавых адходаў (у выпадку наяўнасці тэхнічнай магчымасці ў канкрэтным рэгіёне і эканамічнай мэтазгоднасці). Перадача для перапрацоўкі іншым арганізацыям па магчымасці ўсіх відаў адходаў, што ўтвараюцца, якія дапускаюць паўторнае выкарыстанне.
- Скарачэнне спажывання паперы і фарбы для прынтэраў унутры кампаніі і пры рабоце з кліентамі (капіявання, друку, рахункаў і г. д.) за кошт прасоўвання электроннага дакументаабароту.
- Павышэнне ўзроўню сартавання і скарачэнне аб’ёмаў адходаў праз інфармаванне супрацоўнікаў.



4.2.4. Прыярытэт папераджальна-прафілактычных мер над мерамі па ліквідацыі наступстваў негатыўных уздзеянняў:

- Улік экалагічных рызык і магчымых экалагічных наступстваў на этапе праектавання, стратэгічнага планавання дзейнасці.

- Улік экалагічных патрабаванняў пры правядзенні закупак тэхналогій, матэрыялаў і абсталявання, выканання работ і паслуг падрадчыкамі.

- Прыярытэтнае выкарыстанне матэрыялаў, тэхналогій і абсталявання, бяспечных для навакольнага асяроддзя, сертыфікаваных у адпаведнасці з беларускімі і міжнароднымі экалагічнымі стандартамі.

4.2.5. Адкрытасць і даступнасць экалагічнай інфармацыі:

- Публікацыя дадзенай Палітыкі на афіцыйным сайце кампаніі А1. Давядзенне дадзенай Палітыкі і ўсіх звязаных з ёй дакументаў да ведама ўсіх супрацоўнікаў кампаніі А1.

- Інфармаванне грамадскасці на афіцыйным сайце кампаніі А1 аб рэалізацыі механізмаў экалагічнай адказнасці, прадугледжаных дадзенай Палітыкай і прынятых у яе развіццё ўнутраных нарматыўных дакументаў.



4.2.6. Стварэнне і развіццё экалагічнай культуры, экалагічных каштоўнасцей у кампаніі А1:

- Удзел кампаніі А1 у экалагічных акцыях, якія праводзяцца арганізацыямі і ўстановамі, некамерцыйнымі і камерцыйнымі арганізацыямі, грамадскімі аб’яднаннямі.

- Ажыццяўленне інфармацыйнай падтрымкі мерапрыемстваў адукацыйнай, асветніцкай скіраванасці ў сферы аховы навакольнага асяроддзя, рацыянальнага прыродакарыстання, запаведнай справы, аховы рэдкіх відаў раслін і жывёл.
- Забеспячэнне ўдзелу прадстаўнікоў кампаніі А1 у грамадскіх слуханнях, публічных абмеркаваннях экалагічных ініцыятыў, праектаў нарматыўных актаў, якія закранаюць дзейнасць кампаніі А1, у тых выпадках, калі гэта ўяўляецца магчымым.

- Абавязацельства дзейнічаць адпаведна экалагічным каштоўнасцям кампаніі А1 пры прэзентацыі прадуктаў і паслуг, узаемадзеянні з кліентамі, контрагентамі і іншымі кантактнымі асобамі.

- Матывацыя супрацоўнікаў кампаніі А1 да ўдзелу ў мерапрыемствах па ахове навакольнага асяроддзя. Арганізацыя экалагічнай асветы сярод супрацоўнікаў кампаніі А1 сродкамі карпаратыўных інфармацыйных рэсурсаў.



# 5. Абмежаванні прыдатнасці.

Задачы і мерапрыемствы, пералічаныя ў раздзеле 4 дадзенай Палітыкі, не могуць быць рэалізаваны ў наступных выпадках:

- Адсутнасць тэхнічнай магчымасці іх рэалізацыі ў канкрэтным рэгіёне, дзе ажыццяўляецца дзейнасць кампаніі А1.
- Надзвычай нізкая або нулявая экалагічная эфектыўнасць па не залежных ад дзейнасці кампаніі А1 прычынах знешняга характару.
- Па іншых прычынах знешняга характару, не залежных ад дзейнасці кампаніі А1.



# 6. Адказнасць.

Адказнасць кампаніі А1 па абавязацельствах у межах дадзенай Палітыкі заключаецца ў замацаванні персанальнай адказнасці кіраўнікоў за экалагічныя наступствы прынятых імі кіраўніцкіх рашэнняў, а таксама за паўнату выканання ўзятых кампаніяй абавязацельстваў у рамках прыярытэтных кірункаў дзейнасці, выкладзеных у дадзенай Палітыцы.



# 7. Заключныя палажэнні.

Дадзеная Палітыка выказвае пазіцыю кампаніі А1 у дачыненні да навакольнага прыроднага асяроддзя і рэалізацыі прынцыпаў устойлівага развіцця ў сучасных умовах, з'яўляецца асновай для вызначэння экалагічнай стратэгіі кампаніі, мэтавага планавання яе дзейнасці ў сферы экалогіі на кароткатэрміновы, сярэднетэрміновы і доўгатэрміновы перыяды.

Дадзеная Палітыка з'яўляецца прыярытэтнай і даводзіцца да ведама ўсіх супрацоўнікаў кампаніі А1.

Дадзеная Палітыка падлягае своечасоваму перагляду, унясенню карэкціровак і ўдасканаленню пры змене знешніх умоў, а таксама прыярытэтаў развіцця і ўмоў дзейнасці кампаніі А1.

